Родная газета на родnай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

28 ЛІПЕНЯ 2015 г. АЎТОРАК № 141 (27999) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Ні ў грыбы, ні ў ягады!**

СТАР. 3



**Тое, што турысту трэба**

СТАР. 5



**Адкуль у калодзежы нітраты?**

СТАР. 9

# ЛЮБОЎ І ГАЛУБЫ




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ЗІНОЎСКІ, міністр эканомікі Рэспублікі Беларусь:**

*«Мы не пераглядалі афіцыйны прагноз на 2015 год, які прадугледжвае рост ВУП на ўзроўні 100,2-100,7%. Хоць, зразумела, у розных сцэнарыях даём розныя ацэнкі. Мяркуем, што дасягнутая ў выніку дзеянняў урада і Нацбанка макраэканамічная стабілізацыя, паскарэнне расійскай эканомікі ў другім паўгоддзі, зніжэнне працэнтных ставак Беларусі ўнясуць важны ўклад у паскарэнне эканамічнага развіцця ўжо ў бягучым годзе».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.07.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 15126,00 | ▲ |
| Еўра | 16772,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 256,48 | ▲ |
| Укр. грыўня | 687,55 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Надвор'е

## ПАСВЯЖЭЛА АМАЛЬ ДА ДРЫЖЫКАЎ

### У чацвер і пятніцу максімум тэмпературы складзе 23-25 цяпла

**Сярэднясутачная тэмпература паветра на гэтым тыдні будзе нават трохі ніжэйшай за кліматычную норму, паведамляюць спецыялісты Белгідраметцэнтра.**



Яшчэ ў мінулую нядзелю актыўныя атмасферныя франты выціснулі вельмі цёплае паветра за межы нашай краіны, а з заходнімі вятрамі пачалі паступаць больш свежыя паветраныя масы з поўдня Балтыйскага мора. Таму ў аўторак удзень на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўдзень будзе вагацца ад плюс 19 градусаў па поўначы да 26 цяпла па поўдні краіны.

Кароткачасовыя дажджы, а ў асобных раёнах дажджы і навальніцы, прагназуюцца ўдзень у сераду. Месцамі па паўночным захадзе краіны магчымае ўзмацненне ветру парывамі да 15-18 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 10-17 градусаў, удзень — 19-26 цяпла. У чацвер умовы надвор'я будуць фарміравацца сапраўды халаднаватыя і няўстойлівыя паветраныя масы, якія паступяць да нас з поўдня Скандынавіі.

СТАР. 3

■ Жыллёвая нерухомасць

## ЗНІЖЭННЕ ПА ЎСІХ «ФРАНТАХ»

**За першыя пяць месяцаў года кошт «квадрата» на другасным рынку жылля зніжаўся тэмпам каля 4% за месяц. А ў чэрвені назіраюцца прыкметы стабілізацыі.**

Група кампаній «Твая Сталіца» падрыхтавала аналітычную справаздачу па рынку нерухомасці сталіцы за першае паўгоддзе. Традыцыйна цэны на жыллё беларусы лічаць у доларах, адпаведна, і сваю аналітыку спецыялісты падрыхтавалі ў прывязцы да гэтай валюты.

### РЭАЛЬНЫЯ КОШТЫ ДЫКТУЕ ПРЫГАРАД

Экспертамі было падлічана, што за шэсць месяцаў года кошт квадратнага метра ў новабудоўлях знізіўся ў сярэднім на 16%. На новабудоўлі класа «эканом» і «стандарт» зніжэнне цэн адбывалася досыць плаўна на працягу ўсяго паўгоддзя і склала 12% і 15% адпаведна. У класе «прэстыж» асноўнае зніжэнне цэннікаў прыпала на 2 квартал года і дасягнула 22%. Прадаўцы гэтай катэгорыі жылля ў новым сезоне згаджаліся толькі на мінімальныя саступкі, у надзеі дачакацца «свайго пакупніка».

У сярэднім, па выніках паўгоддзя, цана за квадратны метр у новабудоўлях Мінска склалася на ўзроўні 1439 долараў. Ва ўмовах высокай канкурэнцыі забудоўшчыкі не толькі выкарыстоўваюць розныя маркетынгавыя хады (акцыі, растэрміноўкі плацяжоў), але і згаджаюцца выкарыстоўваць сістэму зніжак нават на этапе заключэння дагавора. Памер такіх саступак дасягае 100 долараў з квадратнага метра.

СТАР. 4